ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕС

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 29 (1065) • Чацвер, 17 кастрычніка 1974 г. • Цана 2 кап. • Газета выходзіць з 1935 г.

ЮНАКІ І ДЗЯЎЧАТЫ! НАСТОЙЛІВА АВАЛОДВАЙЦЕ МАРКСІСЦКА-ЛЕНІНСКІМ ВУЧЭННЕМ, ДАСЯГНЕННЯМІ НАВУКІ, ТЭХНІКІ І КУЛЬТУРЫ! ПАМНАЖАЙЦЕ СЛАЎНЫЯ РЭВАЛЮЦЫЙНЫЯ, БАЯВЫЯ І ПРАЦОЎНЫЯ ТРАДЫЦЫІ САВЕЦКАГА НАРОДА! БУДЗЬЦЕ АКТЫЎНЫМІ БАРАЦЬБІТАМІ ЗА АЖЫЦЦЯЎЛЕННЕ РАШЭННЯЎ XXIV З'ЕЗДА КПСС!

(З Заклікаў ЦК КПСС да 57-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі).

АГУЛЬНЫМ КЛОПАТАМ З'ЯДНАНЫЯ

У мінулым навучальным годзе на геаграфічным факультэце была створана новая кафедра агульнага землязнаўства, якую ўзначаліла доктар геаграфічных навук, прафесар В. П. Якушка, а кіраўніцтва партыйнай групай камуністы даверылі старшаму выкладчыку В. А. Барушка. Зыходзілі, напэўна, з таго, што партгрупоргам новай кафедры можа быць камуніст выключна патрабавальны, чулы, уважлівы, які валодае і многімі іншымі якасцямі.

Перад створанай кафедрай стаяла вельмі многа складаных пытанняў вучэбнай, навуковай, метадычнай, выхаваўчай работы, ды яшчэ ішоў працэс арганізацыі самой кафедры, абсталявання кабінета. У коле клопатаў была і навукова-даследчая лабараторыя возеразнаўства, а таксама мінералагічны музей факультэта.

З першых дзён паміж загадчыцай і партгрупоргам склаліся адносіны поўнага ўзаемаразумення. Вопытны камуніст, член парткома універсітэта, Вольга Піліпаўна Якушка аказвала кампетэнтную дапамогу партыйнай групе ў рашэнні ўсіх пытанняў.

Перш за ўсё неабходна было скласці план работы, умела размеркаваць партыйныя даручэнні. Гэтыя пытанні рашылі ўжо на першым пасяджэнні. Камуніст В. А. Калечыц, акрамя работы ў народным кантролі геафака, узяў на сябе кіраўніцтва студэнцкай лектарскай групай. А. К. Мельнікаву даручана работа са студэнтамі ў інтэрнаце. В. П. Раманаў быў выбран членам камітэта камсамола універсітэта. Умелая расстаноўка камуністаў на самыя адказныя ўчасткі ў многім вызначыла поспех работы партыйнай групы і кафедры ў цэлым.

Вялікую ўвагу партгрупа ўдзяліла ўдасканаленню вучэбнага працэсу. На групавых сходах, пасяджэннях кафедры, вытворчых нарадах, навуковых семінарах абмяркоўваліся праблемы вучэбнай, навуковай работы студэнтаў, актывізацыі іх самастойнай падрыхтоўкі да заняткаў.

Партгрупа ўмела накіроўвала работу куратараў Л. В. Мар'інай і Г. М. Базыленкі, і гэта дало свае вынікі. Паказчыкі паспяховасці, дысцыпліны, удзелу у грамадскай рабоце аказаліся даволі высокімі.

Не сыходзілі з павесткі дня пытанні работы са студэнтамі, дыпломнікамі, вытворчай і грамадска-палітычнай практыкі.

Вырашаючы задачы студэнцкага жыцця, партгрупа абапіралася на камсамольскую арганізацыю лабараторыі возеразнаўства, дзе многа добрых камсамольцаў, нядаўніх выпускнікоў геафака. Камсамольскія справы заўсёды былі ў полі зроку партгрупорга, усіх камуністаў кафедры. Разам з камсамольцамі праводзіліся палітінфармацыі, гутаркі, паходы ў тэатры, паездкі па месцах баявой і працоўнай славы Беларусі і Прыбалтыкі. Гэтая работа дае свае станоўчыя вынікі — студэнты актыўней удзельнічаюць у грамадскім жыцці, лепш вучацца.

Заслугоўвае ўвагі вопыт лекцыйнай прапаганды партгрупы. Толькі за сакавік і красавік 1974 года В. П. Якушка прачытала 8 лекцый, у тым ліку і на Лукомльскай ГРЭС. Актыўна выступаюць з лекцыямі па ахове прыроды і прапагандзе прыродных і культурных каштоўнасцей Беларусі камуністы В. А. Барушка, В. А. Калечыц.

У практыку работы партгрупы трывала ўвайшлі індывідуальныя справаздачы камуністаў аб праведзенай навуковай, навукова-метадычнай, ідэйна-выхаваўчай рабоце.

Дзякуючы мэтанакіраваным намаганням партгрупы працэс станаўлення кафедры быў значна скарочан. Але важных і сур'ёзных задач яшчэ шмат. І камуністы добра разумеюць, што поспех справы ў многім залежыць ад іх саміх, і імкнуцца працаваць так, каб кафедра стала лепшай на факультэце.

Нядаўна партком універсітэта абмеркаваў работу партгрупы кафедры агульнага землязнаўства. Яна заслужыла станоўчую ацэнку.

У. МЯДЗЯНІК,
слухач ІПК.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

СРОДКАМІ НАГЛЯДНАЙ АГІТАЦЫІ

Калі на фізічны факультэт прыходзіць новы чалавек, ён абавязкова зверне ўвагу на выстаўкі, стэнды, плакаты. І няхай не запомніць ён усіх афармленчых дэталяў, але захавае ў памяці даволі аб'ёмнае ўяўленне аб калектыве, які тут працуе, яго буднях і святах, выдатных людзях. Гэта ўздзеянне наглядней агітацыі — адзін з дзейсных сродкаў камуністычнага выхавання.

Прыкметных поспехаў у гэтай рабоце дабілася партыйная арганізацыя факультэта. Тут перш за ўсё звяртае на сябе ўвагу тэматычная разнастайнасць экспазіцый стэндаў. У іх адлюстравана гісторыя універсітэта і факультэта — «Гісторыя фізічнага факультэта за 50 год», гісторыя Савецкай дзяржавы — «50 год СССР», гераічны подзвіг савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне — «30-годдзе вызвалення БССР».

Аб выдатных баявых і працоўных дасягненнях савецкай моладзі расказвае стэнд, прысвечаны камсамолу.

Характэрныя рысы ўсіх экспазіцый — ідэйна-тэматычная накіраванасць, добрае афармленне, багаты ілюстрацыйны матэрыял, умелае спалучэнне гісторыі і сучаснасці.

Вялікае значэнне ў працоўным выхаванні студэнтаў партыйная арганізацыя адводзіць кафедральным стэндам. Цяпер з 14 кафедр 10 маюць свае пастаянныя экспазіцыі. Яны расказваюць аб развіцці кафедр, навуковых дасягненнях, адлюстроўваюць вучэбны працэс. Самы актыўны ўдзел у афармленні наглядней агітацыі прымаюць П. А. Бурынскі, Г. Г. Марозаў, М. І. Юзафовіч, Э. Я. Радоўскі, Г. Я. Лапатаў, А. М. Люцко і іншыя.

Вельмі патрэбнымі і карыснымі аказваюцца ў гэтай рабоце парады і дапамога прадстаўнікоў кафедр грамадскіх навук М. В. Прылепкі, Г. Г. Герасіменкі, І. Т. Рагоўскага.

Адным з важных момантаў з'яўляецца тое, што партбюро вядзе перспектыўнае планаванне наглядней агітацыі. Створана рабочая камісія з ліку студэнтаў і выкладчыкаў, якая распрацоўвае тэматыку стэндаў і клапоціцца аб іх стварэнні.

Напярэдадні новага навучальнага года партбюро разгледзела пытанні наглядней агітацыі на 1974—1975 гг. Быў складзены план, назначана камісія, якой даручана падрыхтоўка стэнда «30-годдзе перамогі над гітлераўскай Германіяй».

Работа па стварэнню наглядней агітацыі адлюстравана і ў планах партыйных груп. Не адзін раз пытанні наглядней агітацыі абмяркоўваліся на партыйных сходах. Разам з тым, ёсць і некаторыя недахопы. Патрэбна больш аператыўна асвятляць на стэндах і плакатах студэнцкае жыццё, спартыўныя, працоўныя дасягненні студэнтаў у трэцім працоўным семестры, шэфскую работу і г. д.

Думаю, што вопыт партыйнай арганізацыі фізічнага факультэта па выкарыстанню сродкаў наглядней агітацыі ў камуністычным выхаванні можа быць цікавым і для іншых факультэтаў.

В. ШЭІН.

НАВІНЫ

Кафедра гісторыі філасофіі і логікі правяла навуковую сесію, прысвечаную 225-годдзю з дня нараджэння А. М. Радзішчава.

Ва ўступным слове пры адкрыцці сесіі загадчык кафедры прафесар А. С. Кляўчэня адзначыў актуальнасць для сучаснасці ідэйнай спадчыны вялікага асветніка.

Затым прафесар В. І. Сцяпанаў прачытаў даклад «Тэорыя пазнання А. М. Радзішчава».

Аб гуманізме Радзішчава гаварыў дацэнт І. А. Рабкоў.

Некалькі выступленняў былі прысвечаны вывучэнню ідэйнай спадчыны вялікага сына Расіі ў Беларусі. У іх ліку даклады кандыдата філалагічных навук дацэнта Л. Л. Кароткай «Радзішчаў і Беларусь» і супрацоўніка інстытута філасофіі і права АН БССР Э. К. Дарашэвіча «Дэмакратычная і утапічна-камуністычная думка канца XVIII стагоддзя ў Беларусі».

Выступіў на гэтай сесіі і госць з Ленінграда дацэнт С. С. Сцепанішчаў з дакладам «Аналіз вывучэння твораў Радзішчава ў савецкай навуцы».

***

На матфаку з дакладам «Аб міжнародным матэматычным кангрэсе ў Ванкуверы (Канада) і сучасным развіцці матэматыкі» выступіў акадэмік АН БССР У. П. Платонаў.

***

Трыццацігоддзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў прысвячаўся злёт турыстаў ДСТ «Буравеснік», які праводзіўся ў Радашковічах. Разам з прадстаўнікамі розных ВНУ рэспублікі ўдзел у ім прыняла каманда універсітэта.

На злёце былі падведзены вынікі летніх студэнцкіх паходаў па месцах баявой і працоўнай славы.

Турысты БДУ ўдзельнічалі ў турысцкім мнагабор'і, спартыўным арыентаванні на мясцовасці, у конкурсах на лепшае афармленне лагера, насценных газет, у выкананні патрыятычнай і турысцкай песень.

ПРАКТЫКА ПРАКТЫКА

Каля карты Беларусі, што вісіць на кафедры глебазнаўства і геалогіі геаграфічнага факультэта, змяняюць адзін аднаго пяцікурснікі. Ідзе абарона справаздач аб вытворчай практыцы.

«Глебава-дэфляцыйная характарыстыка зямель калгаса імя Чкалава Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці» — над гэтай тэмай працавала студэнтка Антаніна Шынкевіч. Разам з кіраўніком, старшым навуковым супрацоўнікам БелНДІГА А. Л. Ярашэвічам, яна прымала ўдзел у даследаваннях, якія праводзіліся на тэрыторыі гэтага ўчастка. Пастаноўка гэтай тэмы мае пэўнае народнагаспадарчае значэнне. Дэфляцыя — выветрыванне — у некаторых месцах выводзіць са строю самыя ўрадлівыя землі. Барацьба з гэтым — злабадзённая задача.

— За распрацоўку такой тэмы мог узяцца толькі чалавек падрыхтаваны, знаёмы з асновамі навуковай работы, — лічыць старшыня адной з камісій па абароне справаздач аб практыцы У. У. Стэцко.—Нездарма ж студэнтка Шынкевіч актыўны член навуковага гуртка «Глебазнаўца». Яе работа, спадзяюся, не толькі ператворыцца ў выдатную дыпломную, але будзе вылучана і на рэспубліканскі агляд-конкурс навуковых работ.

Не менш цікавымі былі работы Пятра Крэйніна «Характарыстыка змен прыродных ландшафтаў Віцебскай вобласці ў выніку распрацоўкі месцанараджэнняў карысных выкапняў» і старасты гуртка Ірыны Чарток «Глеба і ўмовы глебаўтварэння пладова-ягаднага дзяржсортучастка Мінскай вобласці» і многіх іншых.

Акрамя таго, студэнты-пяцікурснікі вялі грамадска-палітычную работу: удзельнічалі ў камсамольскіх сходах на месцах праходжання практыкі, чыталі лекцыі аб універсітэце, арганізоўвалі палітінфармацыі, дапамагалі праводзіць вечары адпачынку, выпускаць насценныя газеты.

Прынямонне—месца праходжання практыкі студэнта пятага курса А. Лайкевіча. Другі год ён прымае ўдзел у экспедыцыі інстытута геахіміі і геафізікі АН БССР пад кіраўніцтвам акадэміка Г. І. Гарэцкага, якая займаецца вывучэннем развіцця даліны ракі Нёман.



ПРАКТЫКА

ПУШЧА ЗАПАВЕДНАЯ

ЛЕТАМ мы ўдзельнічалі ў экспедыцыі аддзела флоры і гербарыя АН БССР па Белавежскай пушчы. Мэтай гэтай экспедыцыі было вывучэнне ўздзеяння антрапагеннага і заагеннага фактараў на ўзнаўленне каштоўных драўняных парод, на змяненне наглебавага покрыву.

Такая пастаноўка пытання выклікана тым, што ў выніку асушэння балот і высечкі лесу ў самой пушчы і прылягаючых раёнах адбываюцца змены ў натуральнай флоры ў сувязі з парушэннямі гідралагічнага рэжыму.

Белавежская пушча з'яўляецца астаткам велізарнай лясной тэрыторыі, што ў далёкім мінулым распасціралася ў басейнах Нёмана. Заходняга Буга, Одэра і Дняпра. Гэты унікальны ўчастак шматвекавога лесу амаль увесь знішчан. Толькі пушча з яе раслінным і жывёльным светам захавалася да нашых дзён дзякуючы склаўшымся гістарычным умовам і ахове.

Расліннасць пушчы — гэта выключнае спалучэнне прадстаўнікоў поўначы і поўдня, усходу і захаду. Тут можна сустрэць піхту белую, дуб скальны, плюшч звычайны, кадзіла мелісалістае і шмат іншых рэдкіх для нашай тэрыторыі раслін.

Але больш за ўсё славіцца пушча зубрамі. З гэтымі «жывымі выкапнямі» цесна звязана яе гісторыя. Гавораць нават, што менавіта зубры выратавалі пушчу, а яна захавала іх.

За апошнія 100 гадоў у флоры Белавежскай пушчы адбываліся некаторыя змены. У складзе флоры ў апошнія гады батанікі не далічваюцца больш 50 відаў раслін. Многія з іх зніклі, відаць, зусім: багноўка, балотны мірт, ажыка вясновая, ціс ягадны і іншыя. На стадыі вымірання знаходзіцца невялікі рэліктавы ўчастак белай піхты.

Такія змены ў флоры пушчы адбываюцца ў выніку вольнага і міжвольнага ўмяшання чалавека ў прыродны комплекс, што складаўся стагоддзямі.

Але ўсё ж, нягледзячы на гэтыя змены, Белавежская пушча ў многім захавала рысы некранутай прыроды. І хто хоць раз пабыў там, пераконваецца ў велічы і прыгажосці векавога лесу. Зноў і зноў цягне нас у гэты цудоўны куток Беларусі.

Таму зараз вельмі важна прыняць усе меры па яе поўнай ахове.

Белавежская пушча — гэта каштоўнейшы натуральна-гістарычны комплекс, які мае сусветнае значэнне для пазнавання флоры і фаўны. Вывучэнне ўсіх бакоў жыцця біягеацэнозу пушчы дазволіць высветліць дынаміку развіцця ўсіх працэсаў, што вызначылі змяненне пушчы ў мінулым і цяпер, у сувязі з гаспадарчай дзейнасцю чалавека.

Вельмі важная роля гэтага аб'екта даследаванняў у святле міжнароднай праграмы «Чалавек і біясфера» з пункту гледжання выяўлення біялагічнай прадукцыйнасці наземных аб'яднанняў, вышукванне шляхоў яе эфектыўнага павышэння.

Хочацца пажадаць аднаго, каб гэты унікальны куток, адзіны у сваім родзе ў Еўропе, стаў запаведнікам у поўным сэнсе гэтага слова.

Д. ТРАЦЦЯКОЎ,
студэнт біяфака.

Ідуць лабараторныя заняткі ў студэнтаў III курса хімічнага факультэта. На здымках вы бачыце Ларысу Байгузіну і Ірыну Выпалзаву за работай.

Кіруе заняткамі старшы выкладчык кандыдат хімічных навук Павел Мітрафанавіч Малашка.

Фота А. Цыгулёва.

УШАНАВАННЕ ЮБІЛЯРАЎ

СВЯТА малдаўскага народа—50-годдзе ўтварэння рэспублікі і яе Камуністычнай партыі—знайшло гарачы водгук у сэрцах усіх савецкіх людзей. Аб гэтым сведчыць і ўрачысты сход слухачоў факультэта павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх дысцыплін сярэдніх навучальных устаноў, які адбыўся ва універсітэце.

Адкрыў яго сакратар партыйнага бюро факультэта выкладчык Пінскага індустрыяльна - педагагічнага тэхнікума П. Ф. Маслаў. Ён адзначыў, што на факультэце вучацца прадстаўнікі многіх саюзных рэспублік, у тым ліку 19 выкладчыкаў з Малдавіі. І хаця ў гэтыя дні малдаўскія таварышы знаходзяцца далёка ад роднага краю, слаўны юбілей сваёй рэспублікі яны святкуюць у шчырай сяброўскай сям'і.

Затым дэкан факультэта дацэнт П. П. Борсук павіншаваў прадстаўнікоў Малдавіі з залатым юбілеем рэспублікі, расказаў пра сувязі, якія растуць і мацнеюць, паміж выкладчыкамі грамадскіх дысцыплін сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў Беларускай ССР і Малдаўскай ССР, іншых брацкіх савецкіх рэспублік.

Шчырыя пачуцці любві і павагі да працалюбівага малдаўскага народа выказалі Ф. А. Філімонаў—выкладчык Талінскага вытворча-тэхнічнага вучылішча, удзельнік Яска-Кішынёўскай аперацыі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Л. Д. Пятрова—выкладчык Запарожскага медвучылішча, М. А. Спрынге — выкладчык ПТВ горада Огрэ (Латвія), С. В. Ваніцкайтэ—выкладчык Каунаскага ПТВ, І. Г. Літвіновіч—выкладчык Маладзечанскага ўлікова - планавага тэхнікума.

Ад імя прысутных на сходзе выкладчыкаў Малдаўскай ССР выступіў І. Н. Куку—выкладчык будаўнічага тэхнікума. Ён расказаў аб вялікіх поспехах, якіх дабіўся малдаўскі народ за 50 год. Пры гэтым ён падкрэсліў:

— Нашы поспехі—гэта вынік брацкага адзінства і непарушнай дружбы ўсіх народаў нашай шматнацыянальнай Радзімы.

На памяць аб знаходжанні ў гэтыя знамянальныя дні ў сталіцы Беларусі горадзе-герої Мінску малдаўскім таварышам былі ўручаны сувеніры.

В. ПАЎЛАЎ,
студэнт.

ВЕСТКІ З ФІЛФАКА

Расшыраная нарада камсамольскага актыву з удзелам прадстаўнікоў партыйнага і прафсаюзнага бюро абмеркавала вынікі летняй экзаменацыйнай сесіі і сельскагаспадарчых работ.

*

На першых курсах прайшлі выбары камсамольскага актыву. На сходах перад малодшымі сябрамі выступілі камсамольцы старэйшых курсаў. Яны падзяліліся вопытам работы, расказалі аб традыцыях факультэта.

С. КАВАЛЕЎСКАЯ.

З ТВОРЧЫМ АГЕНЬЧЫКАМ

На філфаку адбыўся справаздачны прафсаюзны сход. З дакладам аб дзейнасці прафсаюзнай арганізацыі выступіў старшыня прафбюро факультэта В. П. Красней.

Прафсаюзная арганізацыя факультэта глыбока ўсведамляе адказнасць за падрыхтоўку настаўнікаў, у будучым ідэалагічных работнікаў.

Работа ўсяго калектыву, падкрэсліў дакладчык, была ў многім вызначана і акрэслена тымі высокімі сацыялістычнымі абавязацельствамі, якія філфак прыняў на чацвёрты, вызначальны год дзевятай пяцігодкі.

На выніках работы ў 1973 годзе факультэт заняў першае месца. Прафсаюзнае бюро шмат увагі ўдзяляла вучэбна-метадычным пытанням, сістэматычна правяралася правядзенне практычных і семінарскіх заняткаў, калёквіумаў, кантрольных заданняў і работ, прамежкавых залікаў, а таксама ход напісання дыпломных і курсавых работ.

Значную работу праводзіла жыллёва-бытавая камісія, асабліва ў інтэрнаце. Часта правяраўся санітарны стан пакояў, праводзіліся сходы, тэматычныя гутаркі.

Прафсаюзнае бюро працавала на належным узроўні. Выступіўшыя на сходзе В. В. Казлова, В. Ф. Кахно, М. М. Піпчанка, З. П. Варановіч і іншыя адзначылі, што прафсаюзны актыў у цяперашнім складзе значна ажывіў работу ў калектыве.

Аднадушна былі выбраны ў састаў бюро добра зарэкамендаваўшыя сябе прафсаюзныя актывісты.

В. КАЛАДЗІНСКІ.

СПРАВЫ ІНТЭРНАЦКІЯ

ПРАБЛЕМЫ ЁСЦЬ. ЗА РАБОТУ!

ЯК ПА КАМАНДЗЕ, утаймавалася гудзенне галасоў, сціхлі спрэчкі, жарты, смех у зале, запоўненай—усім нават месца не хапіла — жыхарамі інтэрната № 4, што на Паркавай магістралі. Агульны сход пачаўся.

Сёння ў прэзідыуме мы бачым сакратара парткома Т. Я. Дударау, прарэктара па адмгаспадарчай рабоце С. А. Ерамеева. старшыню прафкома А. М. Жылінскага, сакратара камітэта камсамола У. А. Навумовіча, дэкана юрфака В. Ф. Чыгіра, М. Б. Яфімаву — прадстаўніка філфака.

Пакуль прысутныя слухаюць справаздачны даклад старшыні студсавета М. Бародкі, хочацца прывесці некаторыя факты з жыцця інтэрната № 4.

Па-першае, ён адзін з лепшых інтэрнатаў БДУ (II месца), хаця ўсяго некалькі гадоў назад быў, па словах С. А. Ерамеева, самым запушчаным.

Цяпер тут жывуць юрысты, філолагі, біёлагі — усяго 1200 чалавек. Савет ленінскага пакоя інтэрната ўзнагароджан Ганаровай граматай абкома прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў за III месца ў конкурсе на лепшы ленінскі пакой. Акрамя таго, у інтэрнаце каля 20 «пакояў узорнага парадку».

Прыемныя факты і лічбы. Ёсць такія і ў дакладзе М. Бародкі: праведзена восем гутарак, адбылося шэсць лекцый, тры дыспуты, дванаццаць сустрэч, чатыры суботнікі, выклікала цікавасць мастацкая выстаўка, прысвечаная 50-годдзю прысваення камсамолу імя У. І. Леніна.

Праўда, старшыня студсавета не пазбег суб'ектыўнасці, зрабіўшы ўпор на тое, што амаль усё гэта — справа рук юрыстаў. На самай жа справе — і біёлагі (імі асабліва задаволен камендант У. І. Сцяпанаў), і філолагі, і журналісты (апошнія жылі тут у мінулым годзе) папрацавалі добра. Адно «але». Ці кожны дзень, не ў суботнік-нядзельнік, а пастаянна, штодзённа падтрымліваецца парадак і чысціня? У тым жа і адметнасць роднага дома, што жыхар адчувае ўнутраную адказнасць за кожнае крэсла, графін... Дык як?..

— У пакоях больш-менш чыста. У кухні, на калідоры бывае брудна, і, што проста сорам, на жаночай палавіне — цыгарэтны дым слупам, на мужчынскай—бруд, —выступае Наташа Трыгубенка, старшыня жыллёва-бытавой камісіі.

— На жаль, не ўсе першакурснікі зразумелі нашы патрабаванні да жыхара інтэрната, — працягвае Іра Раманчук. — Пара б ім ведаць правілы парадку і таксама клапаціцца аб сваім доме.

— У нас ёсць прэтэнзіі да каменданта: доўга не было гарачай вады, усюды скразнякі, няма бытавых пакояў, —скардзіцца Наташа.

— Успомніце пра замкі, —устае С. Ключук. — Чаму мы самі купляем іх і самі ўстаўляем?

Рэпліка з месца:

— Таму, што самі ламаем!

Пэўна, меў рацыю прарэктар С. А. Ерамееў, калі сказаў:

— Яшчэ не ўсе студэнты пранікліся пачуццём адказнасці за свой дом, таму мы не можам перайсці на самаабслугоўванне ў інтэрнатах, як гэта зрабілі многія ВНУ краіны. Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі заўсёды дапамагаюць у рашэнні інтэрнацкіх праблем, але ж і вы, жыхары, павінны адносіцца беражліва да таго, што дадзена ў ваша распараджэнне.

— Я хачу звярнуць увагу на культуру паводзін, выхаванасць жыхароў, — пачынае размову Таццяна Яфімаўна Дударава. — Заходзіш часам у пакой да хлопцаў — не вітаюцца, ляжаць на ложку ў верхнім адзенні, размаўляюць з табой у паўабарота, а то і адвярнуўшыся. Гэта датычыцца не ўсіх, але такіх выпадкаў зусім не павінна быць.

Хацелася, каб разам з чысцінёй, парадкам на вышыні была і выхаванасць студэнтаў.

Парада слушная. Мабыць адсюль, ад культуры чалавека, ідуць і яго адносіны да чысціні, яго клапатлівасць аб інтэрнаце. Згадзіцеся, што добра выхаваны жыхар не будзе тушыць цыгарэту аб падаконнік ці хадзіць з гітарай па калідоры а дванаццатай гадзіне ночы.

А яшчэ павінен быць дбайны гаспадар. У інтэрнаце № 4 такі гаспадар ёсць. Але і новаму студсавету, і каменданту, і актыву — тым, каму камітэт камсамола і прафком БДУ ўручылі на сходзе граматы, патрэбна неадкладна вырашыць яшчэ мноства пытанняў. Ленінскі пакой, напрыклад, выдатны. Але часта ён... закрыты. Або недахоп сталоў у чытальнай зале. Цяпер тут яшчэ пуста, ну, а як надыдзе сесія?

— Ці ёсць у вас жаданне заняць першае месца сярод інтэрнатаў ВНУ Мінска? — спытаў рабят на сходзе камендант У. І. Сцяпанаў.

— Ёсць! — дружна прагучала ў адказ.

У добры час. Работа чакае.

С. УСЦІНОВІЧ.

ДОЛЯ ПРАЦЫ ТВАЁЙ

Рэспубліканскі злёт СБА, які адбудзецца 19 кастрычніка, падвядзе вынікі працоўнага лета-74. З добрымі поспехамі падышлі да яго студэнцкія будаўнічыя атрады БДУ.

У працоўным семестры 1974 года, прысвечаным 50-годдзю прысваення камсамолу імя У. І. Леніна і 30-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, удзельнічала больш за 1870 студэнтаў універсітэта, што працавалі ў 59 будаўнічых атрадах.

Байцы правялі за лета вялікую ідэйна-выхаваўчую і грамадска-палітычную работу: 265 лектараў СБА прачыталі 465 лекцый і дакладаў аб родным універсітэце, ролі моладзі ў грамадскім прагрэсе, аб дружбе народаў, аб міжнародным руху моладзі, аб юбілею камсамола, аб вызваленні нашай рэспублікі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і г. д.

Арганізавана 277 канцэртаў, праведзен тыдзень «Юнацтва выкрывае імперыялізм», працоўная вахта «Савецкая моладзь —патрыётам Чылі», дзень ударнай працы ў фонд будаўніцтва і добраўпарадкавання горада Гагарына. З вялікім поспехам прайшла кампанія «Камсамол—сельскай школе». Пабудавана 5 школ, перададзена каля 2 тысяч кніг. Байцы атрадаў рамантавалі школы і дапамагалі рыхтаваць іх да новага навучальнага года. Добра зарэкамендавалі сябе піянерскія лагеры-спадарожнікі для рабят сельскіх школ. Як і раней, асаблівага цікава работу са школьнікамі арганізавалі атрады філалагічнага факультэта «Верасок» і «Буравеснік».

Ва універсітэцкія СБА было ўключана 19 цяжкавыхоўваемых падлеткаў— вучняў сярэдніх школ Кастрычніцкага раёна горада Мінска, з якімі вялася адпаведная работа. Выдатна правялі сваё працоўнае лета 32 замежныя студэнты, якія працавалі ў СБА.

У гэтым годзе будаўнічымі атрадамі універсітэта асвоена 3 860 тысяч рублёў капіталаўкладанняў, пабудавана 14 жылых дамоў, 20 сельскагаспадарчых фермаў, 5 школ, 43 кіламетры меліярацыйных каналаў, сабрана 10 тысяч тон сельгаспрадукцыі.

На факультэтах вядомы лепшыя атрады. У філолагаў гэта «Мара», «Верасок» і «Буравеснік», у гісторыкаў—атрад імя Ленінскага камсамола, у матэматыкаў—«Расінка».

30 лепшых студэнтаў-будаўнікоў БДУ прадстаўлены да ўзнагароджання памятным значком «Ударнік СБА».

Аднак у арганізацыі працоўнага семестра былі і недахопы, выпадкі парушэння статута СБА. Некаторыя будаўнічыя атрады не сталі яшчэ сапраўднымі цэнтрамі ідэйна-палітычнага выхавання моладзі.

Былі выяўлены (праўда, хутка ліквідаваны) выпадкі нядобрасумленных адносін асобных байцоў СБА да медагляду і экзамена па тэхніцы бяспекі. Некаторыя атрады не былі поўнасцю ўкамплектаваны.

Асаблівую ўвагу трэба будзе звярнуць на больш якасны падбор камандзіраў СБА.

Нельга забываць, што студэнцкі атрад—гэта атрад палітычнага, працоўнага і маральнага выхавання моладзі, атрад, дзе знаходзіць сваё адлюстраванне імкненне студэнцтва актыўна ўдзельнічаць у рашэнні практычных задач камуністычнага будаўніцтва.

С. КУНІЦКІ,
камісар штаба працоўных спраў.

СЕМЕСТР— НА ВЫДАТНА

Гэтым летам упершыню будаўнічымі атрадамі фізфака пяройдзен мільённы рубеж па суме капіталаўкладанняў. Чатырнаццацю атрадамі факультэта асвоена больш за 1100 тысяч рублёў.

Гэта выдатны адказ на рашэнне XVII з'езда ВЛКСМ — асвоіць у час працоўнага семестра 1974 года больш мільярда рублёў капіталаўкладанняў. Асабліва добра працавалі ў гэтым годзе цалінныя СБА: «Аэліта» (асвоена 220 тысяч рублёў), «Спектр» (113 тысяч рублёў), «Чапаевец» (109 тысяч рублёў) і беларускі атрад «Кваркі-74» (120 тысяч рублёў). Аб адным з атрадаў расказвае яго камісар:

Наш СБА «Спектр-74» фарміраваўся ў аспоўным са студэнтаў III курса. Усе рабяты падабраліся па-сапраўднаму баявыя.

Атрад працаваў дзвюма брыгадамі. Першая ў п. Базар-Цюба будавала школу на 480 месц, рамонтныя майстэрні, а таксама ўдзельнічала ў вырабе цэглы. І за што б ні браліся нашы байцы, усё атрымлівалася так, як трэба. Першы паверх школы, пабудаваны яшчэ «Спектрам-73», быў цалкам атынкаваны. Акрамя таго, скончана кладка сцен, узведзен дах. І ўсё гэта зрабілі мы самі!

Не заўсёды, вядома, нам было лёгка, як гэта можа паказацца. Не заўсёды ўсё было гладка ў рабоце. Асабліва было прыкра, калі ўзнікалі прастоі, напрыклад, з-за адсутнасці будматэрыялаў ці тэхнікі.

Другая брыгада працавала ў п. Калмыкава на будаўніцтве клуба, дзіцячага сада і будынка пасялковага Савета дэпутатаў працоўных.

Запланаваны аб'ём работы быў выкананы. Поспех студэнтаў адзначылі ў ПМК-810, а 12 жніўня, у Дзень будаўніка, байцам былі ўручаны Ганаровыя граматы, каштоўныя падарункі.

А. КАЗАКЕВІЧ,
камісар атрада «Спектр-74».

Будоўля. Бетон, разгрузка цэглы, кладка сцен — усё гэта надоўга застанецца ў паляці байцоў атрада «Чырвоная змена», студэнтаў-фізікаў, якія працавалі мінулым летам ў г. п. Крупкі. І да наступнага лета, да наступнага будатрада застанецца Віця Пагоцкі — шэфам бетону, а Сяргей Сінкевіч — увогуле майстрам на ўсе рукі...

Фота *Т. Сахашчык.*

«Сонечны»— так называецца гарадскі атрад студэнтаў хімфака, які займаўся гэтым летам добраўпарадкаваннем Мінска. Дзяўчаты знайшлі і ў гэтай справе сапраўдную будатрадаўскую рамантыку. Яны адзярноўвалі броўкі, засявалі травой газоны, будавалі спартыўныя пляцоўкі каля новых школ, а пасля работы часта выступалі з цікавымі і змястоўнымі канцэртамі.

На здымку В. Цішкоўскай: працуюць Юля **Вясельская** і Люда **Данільчык.**

БЫВАЙ, ПРАЦОЎНАЕ ЛЕТА

«Што за працаўнікі паявіліся ў нас! — гаварылі паміж сабой рабочыя цагельнага завода «Сярэднякі», што ў Крупскім раёне Мінскай вобласці. — Кожны год да нас прыязджалі студэнты-будатрадаўцы, але такіх яшчэ не было. Малайцы рабяты!».

Прыемна было чуць такія водгукі байцам атрада «Рабфакавец-74», былым рабочым і дэмабілізаваным з Савецкай Арміі воінам. Атрад гэты вызначаўся яшчэ і тым, што тры чвэрці яго саставу (15 з 20 байцоў)— камуністы.

Працаваў «Рабфакавец» усяго толькі месяц, але і за такі кароткі час паспеў зрабіць нямала. Пры плане асваення ў пяць тысяч атрад асвоіў амаль на тысячу рублёў больш. І гэта пры пастаянных дажджах на працягу жніўня, калі нельга было браць з кар'ераў гліну. Гэта значыць на нейкі час спынялася вытворчасць цэглы-сырцу. Але студэнты і ў такія хвіліны не спыняліся. Яны адразу шукалі новую справу, каб не губляць марна час.

Вельмі хочацца адзначыць работу Сашы Андрэева, Віктара Галаванава, Вячаслава Шчэрбіка. Не вельмі адставалі ад іх дзяўчаты Лена Заяц і Валя Юрчанкова.

А вось Ігар Лебедзеў, напрыклад, асвоіў спецыяльнасць садчыка ў некалькі дзён і разам з памочнікам Леанідам Дышлэвічам выконваў кожны дзень паўтары-дзве нормы.

Нядрэнна спраўляліся са сваімі абавязкамі атрадныя павары Ніна Ачакаўская і Таня Пілчанка. Рабяты не раз гаварылі, што нават дома абед часам бывае не такі смачны, як у атрадзе.

На працягу месяца атрад правёў тры нядзельнікі ў саўгасе «Заклік», акрамя таго, разам з мясцовай моладдзю арганізаваў «Агеньчык» і канцэрт мастацкай самадзейнасці.

Ф. ЯРМОЛЕНКА,
студэнт I курса юрфака.

АТРАД СТВАРАЕ ХАРАКТАР

АКРАМЯ асваення тысяч рублёў капіталаўкладанняў, акрамя дапамогі народнай гаспадаркі, акрамя шэфства над сельскімі школамі, адным словам, акрамя паказчыкаў, выканаць якія імкнецца любы атрад, ёсць у СБА яшчэ адно прызначэнне. Мы маем на ўвазе станаўленне калектыву.

Уладзімір Карагін, камандзір СБА імя Ленінскага камсамола, лічыць, што «чарнавік» калектыву склаўся яшчэ ў час падрыхтоўчага перыяду.

Ці магчыма наогул ужываць такі тэрмін: падрыхтоўчы перыяд—«чарнавік» калектыву? Давайце звернемся да вопыту гэтага атрада.

СБА імя Ленінскага камсамола — своеасаблівы эксперымент, удзельнікамі якога сталі ўсе байцы. А іх камандзір, студэнт другога курса філасофскага аддзялення гістарычнага факультэта Уладзімір Карагін (дарэчы, камандзірам атрада будаўнікоў з падрыхтоўчага аддзялення ён быў ужо ў мінулым годзе), захапляецца псіхалогіяй камуністычнага выхавання. На гэтую тэму ён пісаў курсавую работу. Таму станаўленне атрада для яго гэтым летам— праверка тэорыі практыкай.

Галоўным прынцыпам падбору ў атрад была праверка адносін кожнага да працы. Ажыццявіць яе дапамаглі суботнікі, нядзельнікі і працоўныя дэсанты ў трэсце «Мінскрадыёбуд», пасля якіх адны з кандыдатаў пераканаліся. што атрад едзе не забаўляцца, а працаваць, другія — што заработак не самае галоўнае імкненне рабят.

Трэба дадаць, што байцы падбіраліся зусім не па ўзроўню фізічнай сілы (а такое дзе-нідзе ўсё ж сустракаецца).

— Вось, напрыклад, Рая Валіева — маленькая, кволая дзяўчына. Але яна так імкнулася ў атрад, так старалася працаваць, што мы не змаглі яе не прыняць, — расказвае парторг Ліля Шыдлоўская.

— Доўга ў атрадзе шукалі Раі справу па сілах, — дадае камандзір,—а потым знайшлі: Рая працавала з хлопцамі - бетоншчыкамі. Пасля заліўкі падлогі наводзіла «апошні бляск» — разгладжвала няроўнасці. Гэта павышала якасць.

Атрад працаваў на будаўніцтве піянерскага лагера пад Радашковічамі.

Непасрэдная работа на месцы дыслакацыі стала працягам той, якая вялася ў час падрыхтоўкі да трэцяга семестра. Атрад быў разбіт на некалькі брыгад. У СБА імя Ленінскага камсамола яны — не толькі працоўныя адзінкі, але своеасаблівыя мікракалектывы, у якіх рабяты падабраліся па вытворчаму прынцыпу. Брыгада Юрыя Голубева — цесляры, Мікалая Кобрыка —муляры. Аднак, калі трэба, муляры бяруцца будаваць дарожкі, а цесляры дапамагаюць бетоншчыкам і наадварот. Справа ж ва ўсіх агульная.

Кожная брыгада — камсамольская група са сваім камсоргам, са сваім планам мерапрыемстваў. Такі прынцып дазваляе развіваць самастойнасць кожнага.

Што ж датычыцца работы. то асноўная вытворчая адзінка атрада — звяно. Кожны вечар, плануючы наступны дзень, камандзір і майстар нанава камплектуюць звенні ў адпаведнасці з характарам работы. Звяно зусім не абавязкова складаецца на аснове адной брыгады. На будаўніцтве плоту вакол лагера, напрыклад, патрэбны былі самыя дужыя хлопцы — і там працавалі байцы з розных брыгад.

Як жа ў такім разе падводзіліся вынікі сацыялістычнага спаборніцтва паміж брыгадамі? Вельмі проста. Па якасці работы кожнага байца. Па яго адносінах да працы. А гэта хоць і нельга абазначыць дакладнымі лічбамі, затое ва ўсіх на вачах. Калектыўнае меркаванне дазваляла не рабіць памылак у адзнаках...

Можна расказваць доўга аб цікавых справах атрада. Аб тэматычных вечарах ля кастра, аб днях спорту, якія праводзіліся ў кожны чацвер, аб рабоце з «цяжкімі» падлеткамі, аб атрадным кансультацыйным пункце, аб сувязях з мясцовымі жыхарамі, аб канцэртах і лекцыях, аб конкурсах атраднай самадзейнасці і конкурсах грыбнікоў, аб «баявых лістках», якія выпускала кожная брыгада.

Бясспрэчна адно: уся цікавая і паспяховая работа —вынік з'яднанасці калектыву. І байцы, і члены штаба атрада лічаць, што яны не зрабілі б так многа, каб іх не падружыў падрыхтоўчы перыяд, калі б яшчэ тады не склаўся той самы «чарнавік» калектыву.

— Людзей трэба ведаць загадзя. У гэтым — будучы поспех атрада, — лічыць Лілія Шыдлоўская.

А камандзір марыць аб круглагадавым цыкле жыцця атрада, аб пастаянных сувязях яго з вытворчай арганізацыяй, аб заключэнні доўгатэрміновых дагавораў.

Гэта ўсё наперадзе.

Т. АБРАМОВІЧ.

Доўга не змаўкалі ў суботу песні і жарты на святочным геафаку — ішло пасвячэнне першакурснікаў у студэнты.

Фота М. ЕЎДАКІМЕНКІ.

УСЕ НА КРОС!

З пачаткам навучальнага года ажывілася спартыўная работа ва універсітэце. Студэнты здаюць нормы ГПА, удзельнічаюць у спаборніцтвах.

У перыяд дэкады першакурснікаў кафедра фізвыхавання і спартыўны клуб БДУ праводзяць шэраг спаборніцтваў сярод студэнтаў першых курсаў. Самыя масавыя з іх — розыгрыш кубка асенняга кросу.

Упершыню гэты кубак разыгрываўся ў кастрычніку 1971 года ў гонар 50-гадовага юбілею універсітэта. Перамаглі тады студэнты біялагічнага факультэта. Кэля 500 студэнтаў універсітэта выканалі разрадныя нарматывы.

У 1972-1973 гадах таксама перамаглі студэнты біялагічнага факультэта.

І вось 20 кастрычніка на Камсамольскім возеры кубак будзе разыгрывацца ў чацвёрты раз. Пачатак спаборніцтваў у 10 гадзін.

27 кастрычніка будзе праведзен фінал асенняга кросу па праграме XXIII агульнауніверсітэцкай спартакіяды.

Гэтыя кросы прысвячаюцца знамянальнай падзеі — прысваенню гораду Мінску ганаровага звання «Горад-герой».

Кафедра фізвыхавання і спартыўны клуб заклікаюць першакурснікаў і студэнтаў старэйшых курсаў прыняць актыўны ўдзел у гэтых спаборніцтвах і дабіцца добрых спартыўных вынікаў.

В. ШАПЯЛЕВІЧ,
старшыня спартыўнага клуба БДУ.

З УСПАМІНАЎ АБ ЛЕЦЕ

БУДЗЕМ ПАМЯТАЦЬ ДОЎГА

Студэнцкае лета прамільгнула, нібы птушка, пакінуўшы аб сабе толькі ўспаміны.

Удзельнікам мастацкіх калектываў БДУ надоўга запомніцца паездка на VI свята студэнцкай песні ў адзін са старажытнейшых гарадоў Эстонскай ССР — Тарту.

За два дні да адкрыцця свята ў Тартускім універсітэце адбылося выступленне народнай харавой капэлы нашага універсітэта.

...Уявіце сабе старажытны будынак універсітэта. Спецыфічны пах, як у музеі. Мы сядзім у зале на балконе з белымі ажурнымі поручнямі і слухаем музыку. Зверху звешваюцца на доўгіх цяжкіх ланцугах вялізныя люстры з лямпачкамі ў выглядзе свечак. Ціха. Толькі стройныя гукі старадаўняга мадрыгалэ плаваюць у гэтай цішыні. І раптам праз расчыненыя вокны даносіцца бой гадзінніка старой гарадской ратушы...

І вось, нарэшце, адкрыцё свята. Ад пеўчага каменя мы ідзём з факелам па вуліцах. Калона расцягнулася да самага пеўчага поля. Усю дарогу гучаць песні. Нам прыветліва махаюць. Усюды ўсмешкі на тварах.

— Савецкаму студэнцтву «ўра!»

— Слаўнаму гораду Тарту «ўра!»

— Ура! — падхопліваюць людзі на тратуарах.

Праз некаторы час мы выстройваемся на сцэне, а з процілеглага боку ўніз яшчэ спускаюцца ўсё новыя і новыя калектывы ў яркім нацыянальным адзенні. Прыгажосць такая, што не адвесці вачэй.

Змяняюцца аркестры.

Нарэшце, усё замірае. На полі выстройваюцца «кветочкай» танцоры. Гучаць фанфары. Успыхвае агонь VI студэнцкага свята песні.

І вось грымнуў «Гімн студэнтаў». Ад хвалявання цяжка спяваць — настолькі велічна і ўрачыста гучыць песня ў выкананні зводнага шасцітысячнага хору.

...Верой полна, дружбой сильна,
Молодость наша
борьбе за мир верна...

Словы вымаўляюцца кожным, як клятва.

...Я веру, што ніхто з нас ніколі не забудзе гэтых дзён, сваіх сяброў, з якімі нас звёў лёс тут, на гэтым цудоўным свяце. І дзяўчаты з капэлы доўга яшчэ будуць успамінаць народны мужчынскі хор Маскоўскага фізіка-інжынернага інстытута—«пареньков с московскими гитарами», іх песні, якія яны могуць пець нават па 14 гадзін запар.

Два дні, з чатырох гадзін да позняга вечара перад жыхарамі Тарту выступалі студэнцкія танцавальныя калектывы, народныя аркестры з розных рэспублік.

Пасля закрыцця свята доўга яшчэ кружыліся карагоды ў парку сярод бяроз. Вечар дружбы... Бясконная ноч. Ідзём на даўно апусцеўшае пеўчае поле. Развітваемся з горадам. Праводзім дадому чыгуначныя саставы, у якіх ад'язджаюць новыя сябры. Раніцай гэтак жа будуць праводзіць і нас.

Крыху сумна і разам з тым радасна. Наперадзе новыя сустрэчы.

С. ТРУКШЫНА.

ПРЫЕМНАГА АПЕТЫТУ

Добры падарунак калектыву БДУ зрабілі будаўнікі рамонтна-будаўнічага ўпраўлення № 5 Белгандальбуда, здаўшы ў эксплуатацыю новую сталовую ў галоўным корпусе універсітэта.

Некалькі месяцаў цокальнае памяшканне было будаўнічай пляцоўкай. Рабочым дапамагалі супрацоўнікі універсітэта, студэнты.

Новая сталовая разлічана на 120 месц. У ёй добрая вентыляцыя, ліфт, які значна аблягчае работу абслугоўваючага персаналу, ёсць тут і халадзільныя камеры.

Асобныя цэхі прызначаны для прыгатавання мясных, рыбных, халодных і гародніннных страў.

Высокакваліфікаваныя спецыялісты, такія, як загадчыца вытворчасці Тамара Ільінічна Баўтрук, Людміла Варушкіна, Людміла Сасуновіч, Лілія Васюкевіч, клапоцяцца аб тым, каб ежа была каларыйнай і смачнай.

Да заняткаў студэнты могуць тут хутка паснедаць. Нямнога часу займае і абед. Гасцінна запрашае сталовая наведвальнікаў і ўвечары.

Ужо з першых дзён дружным і зладжаным паказаў сябе камсамольска-маладзёжны калектыў.

Л. НОВІКАЎ,
студэнт.

ПЕРШАКУРСНІКУ РАІЦЬ УРАЧ

НЕ ЗЛОЎЖЫВАЙЦЕ САМАСТОЙНАСЦЮ

У вашым жыцці настаў доўгачаканы момант. Вы скончылі школу і адчулі сябе самастойнымі і дарослымі. Вы сталі студэнтамі першага курса вышэйшай навучальнай установы.

Але было б памылкай лічыць, што скончыў школу—і ужо дастаткова дарослы чалавек.

Арганізм юнака і дзяўчыны ў 17—18 год яшчэ працягвае развівацца і ўдасканальвацца. Многія адхіленні ў нармальным спосабе жыцця могуць прывесці да розных захворванняў.

Назіранні педагогаў вышэйшай школы сведчаць аб тым, што сярод першакурснікаў самы нізкі працэнт паспяховасці і самы высокі працэнт адсеву і захворванняў.

Прычынамі гэтага з'яўляецца няўменне студэнтаў-першакурснікаў самастойна арганізаваць сваю вучэбную працу ў новых умовах, парушэнне імі рэжыму сну, харчавання, адпачынку, злоўжыванне самастойнасцю.

Рабочы дзень кожнага чалавека пачынаецца з арганізацыі ранішняга часу. Ад таго, наколькі правільна ён будзе праходзіць, залежыць паўнацэннасць усяго працоўнага дня.

Незалежна ад таго, у якой змене займаецца студэнт-першакурснік, ён павінен уставаць заўсёды ў вызначаны час — у 7—8 гадзін. Ранішняя гімнастыка з водпай працэдурай «зараджае» арганізм на ўвесь дзень.

Абавязкова снедайце! Часта даводзіцца наглядаць, як студэнты, ледзь дачакаўшыся званка з першай пары заняткаў, спяшаюцца ў буфет або жуюць бутэрброды, не выходзячы на перапынак, таму што, баючыся спазніцца, яны не толькі не выпіваюць хаця б шклянку чаю ці малака, а зусім галоднымі бягуць на лекцыі. У лепшым выпадку яны паспяваюць перакусіць на перапынку, у горшым — чакаюць да абеду.

Сняданне павінна быць паўнацэнным і дастаткова сытным, складаць 20—25 працэнтаў агульнага рацыёну. Харчавацца патрэбна не радзей 3 разоў у суткі, спакойна, без спешкі. Есці патрэбна самую разнастайную ежу з дастатковай колькасцю неабходных для арганізма рэчываў.

Арганізм пасля працоўнага дня мае патрэбу ў адпачынку. Такім адпачынкам з'яўляецца нармальны, спакойны сон. Спаць у вашым узросце патрэбна не менш 7—8 гадзін. Між тым у студэнта вечарам заўсёды знаходзіцца маса неадкладных спраў, у выніку якіх парушаецца рэжым сну. А раніцай вы паднімаецеся з галаўным болем, раздражнёнымі, не паспяваеце як след падрыхтавацца да вучэбных заняткаў.

Недахоп сну не можа быць кампенсаваны ні ў выхадныя дні, ні у час канікул. Недасыпанне і адсыпанне прыводзяць да ператамлення нервовай сістэмы, паяўлення працяглай галаўной болі, зніжэння працаздольнасці.

Перад сном неабходна добра праветрыць пакой, а лепш за ўсё прывучыць сябе спаць з адчыненай фортку. Чысціня і свежасць паветра — аснова моцнага сну. Нельга спаць у пакоі, насычаным тытуневым дымам.

Праца студэнта напружаная. Няправільна арганізаваны рабочы час прыводзіць да стамлення арганізма, парушэння памяці, увагі, рэзкага зніжэння працаздольнасці, узнікнення цэлага раду захворванняў.

ВОСЕНЬСКІЯ МАТЫВЫ

Фота М. ХАМЦА.

«Белорусский университет» —орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Аб'ем — 1 друк. ар. **Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА**
Газета выходзіць па чацвяргах.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Тыраж 2000 экз. **АТ 11448** Зак. № 1322.